Алесь Лозка

начальнік аддзела традыцыйнай культуры
і аматарскай творчасці
ДУА «Інстытут культуры Беларусі»,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Мінск, Беларусь)

# Праблемы сістэматызацыі і мадэрнізацыі клубных устаноў

У 1991 г. на змену «Палажэння аб клубных установах сістэмы Міністэрства культуры БССР» (1984 г.) уводзяцца «Агульныя прынцыпы дзейнасці дзяржаўных клубных устаноў» [2, *5—12*]. Новы дакумент у дэмакратычнай манеры прадпісваў асноўныя прынцыпы стварэння клубных устаноў, тыпы якіх вызначаюцца ў залежнасці ад асноўных напрамкаў дзейнасці. Клубныя ўстановы могуць быць аднапрофільнымі і шматпрофільнымі, створанымі па адміністрацыйна-тэрытарыяльнаму прынцыпу, з універсальна-комплексным характарам ці па спецыялізацыі асобнага напрамку дзейнасці.



Напрамкі спецыялізацыі ўдакладняліся: скіраваныя на зберажэнне і развіццё нацыянальнай культуры, традыцыйных форм адпачынку, рамёстваў; на культурныя інтарэсы вызначаных прафесійных, нацыянальных і іншых сацыяльна-дэмаграфічных катэгорый насельніцтва (клубы, цэнтры, дамы сельскай інтэлігенцыі, жывёлаводаў, дзяцей, моладзі, жанчын, пенсіянераў, інвалідаў, майстроў музычнай культуры, фальклору, кіно, кнігі, рамёстваў, цэнтры нацыянальных культур і г. д.); перасоўны характар дзейнасці (аўтаклубы, плаваючыя культбазы, клубы і інш.); сумяшчаюць асноўную функцыянальную дзейнасць з работай іншых тыпаў устаноў культуры, побыту, спорту, гандлю (клубы-чытальні, клубы-бібліятэкі, клубы-музеі, клубы-выставы, культурна-спартыўныя і культурна-вытворчыя цэнтры і г.д.).

Працэсы адраджэння нацыянальнай свядомасці, развіцця народнай творчасці, разняволення грамадскай ініцыятывы спарадзілі новыя ўнікальныя тыпы клубных устаноў, у тым ліку аднапрофільныя: дамы (цэнтры) рамёстваў, цэнтры ганчарства, дамы ганчара, цэнтры драўлянай скульптуры, цэнтры ткацтва, дамы майстра, цэнтры (дамы) фальклору, этнаграфічныя цэнтры (народнага быту), цэнтры (дамы) народнай (нацыянальнай, традыцыйнай) творчасці (культуры), дамы мастацкай самадзейнасці, цэнтры народнага танца, музыкі і песні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Яшчэ большая разнастайнасць атрымалася сярод клубаў універсальна-комплекснага характару (палацы, цэнтры, дамы культуры, сельскія клубы і інш.) і шматпрофільнага: установы, якія сумяшчаюць клубную дзейнасці з асветнай і адукацыйнай (цэнтры эстэтычнага выхавання дзяцей, цэнтры дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, спартыўна-эстэтычныя цэнтры), са спартыўнай (культурна-спартыўныя цэнтры і інш.), з дзейнасцю сацыяльных паслуг (дамы сацыяльна-культурных паслуг, культурна-дзелавыя цэнтры і інш.), з бібліятэчнай (клубы-бібліятэкі), з музейнай (клубы-музеі), з народна-творчай (цэнтры традыцыйнай культуры, народнай творчасці, фальклору, рамёстваў, нацыянальных культур і інш.), з турыстычнай (турыстычныя дамы, гісторыка-турыстычныя цэнтры і інш.), з гістарычна-краязнаўчай (культурна-гістарычныя комплексы, дамы фальклору і краязнаўства інш.), з экалагічнай (эколага-культурныя цэнтры) і інш. Атрымалі развіццё перасоўныя ўстановы — аўтаклубы, якія маюцца ў кожнай вобласці (усяго 91).

Цяпер у сістэме Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь функцыянуе больш за 90 дамоў (цэнтраў) рамёстваў (дамоў майстра), каля 200 дамоў (цэнтраў) народнай творчасці, фальклору, 184 клубы-бібліятэкі, 7 клубаў-музеяў, больш за 30 дамоў сацыяльных паслуг, 24 культурна-спартыйныя цэнтры і інш. Маюцца адзінкавыя ў сваім родзе ўстановы — цэнтр цыркавога мастацтва, цэнтр эстэтычнага выхавання, цэнтр драўлянай скульптуры, дзіцяча-юнацкі спартыўна-эстэтычны цэнтр, культурна-гістарычны комплекс.



Цяжкасці сістэматызацыі ўстаноў культуры клубнага тыпу звязаны з рознымі акалічнасцямі: розныя назвы клубаў, якія маюць падобныя мэты і задачы; неадпаведнасць назвы і дэкларуемага профілю задачам і асноўным кірункаў клуба, складанасць (не аператыўнасць) з іх рэгістрацыяй-перарэгістрацыяй і інш. Напрыклад, пералік статутных задач і кірункаў дзейнасці цэнтра народнай творчасці можа прыблізна супадаць з цэлым шэрагам устаноў: сельскі цэнтр адпачынку і народнай творчасці, сельскі цэнтр адпачынку і народнай культуры, цэнтр народнай культуры, дом (цэнтр) культуры і народнай творчасці, дом народнай творчасці і мастацкай самадзейнасці, дом народнай культуры і адпачынку, цэнтр рамёстваў і традыцыйнай культуры, дом рамёстваў і фальклору, дом нацыянальных культур і рамёстваў, цэнтр культуры і народных традыцый, цэнтр народнай культуры і вольнага часу і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Акрамя таго, неабходна мець на ўвазе, што паняцце «народная творчасць (мастацтва)», як калектыўная мастацкая дзейнасць, уключае ўсе віды непрафесійнага мастацтва, а менавіта, народную паэтычную творчасць (фальклор), народную музыку, тэатр, танец, дойлідства, мастацкія промыслы і рамёствы, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, аматарскае мастацтва і інш. [1, *228*]. Таму не карэктна ў найменнях устаноў, напрыклад, пасля словазлучэння «народная творчасць (мастацтва)» дадаваць «і рамёстваў», «танца і музыкі» і т.п.

Таксама неабходна прывесці ў адпаведнасць з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» і новымі лексічнымі слоўнікамі, створаных паводле яго, найменні ўстаноў, статутную і іншую дакументацыю. Напрыклад, не прымальна выкарыстанне рускай калькі «досуг», якая вельмі шырока прымяняецца, замест «вольны час» у беларускамоўных адпаведніках («культурно-досуговая деятельность» — «культурная дзейнасць у вольны час», «культурно-досуговое учреждение» — «культурная ўстанова вольнага часу» і г.д.).



Правамернае выкарыстанне вялікай літары ў словах *Дом, Палац*, якія пачынаюць найменне ўстановы [4, *48*]. Напрыклад, Палац культуры «Лошыцкі», але Старасельскі сельскі дом культуры, Магілёўскі гарадскі цэнтр культуры і вольнага часу, дзяржаўная ўстанова культуры «Гарадскі палац культуры “Орша”».

У цэлым неабходна заўважыць, што ў Беларусі склалася мадэльная сетка ўстаноў культуры клубнага тыпу на прыкладзе лепшых клубаў, якія маюцца ў кожнай вобласці. Патрабуецца сістэмная мадэрнізацыя клубнай дзейнасці і іх метадычнага забеспячэння па асобных прынцыпах, кірунках, у тым ліку тых, пра якія закраналася тут, падцягванне маральна адсталых устаноў да ўзроўню лепшых, перспектыўных, а таксама:

стварэнне гарадской метадычнай службы для ўстаноў клубнага тыпу там, дзе яна адсутнічае;

выданне рэспубліканскага метадычнага часопіса для работнікаў клубных устаноў;

правядзенне круглых сталоў, майстар-класаў, рэспубліканскіх семінараў па фалькларыстычнай, этналагічнай і мастацтвазнаўчай тэматыцы;

шырокае ўкараненне ў вучэбны працэс устаноў адукацыі і клубных устаноў інавацыйных тэхналогій, тэхнічных сродкаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкарыстанне замежных інавацый па стварэнню новых комплексных устаноў клубнага тыпу (сацыякультурных кластараў, сельскіх сацыякультурных комплексаў, шматфункцыянальных цэнтраў культурнага развіцця, інавацыйных культурных цэнтраў (дамоў новай культуры, або ДНК-цэнтраў і інш.) [3, *21—30*];

распрацоўка рэкамендацый паводле замежнага вопыту для фарміравання іміджу ўстаноў культуры вольнага часу і прыняцце стандартаў якасці аказання культурных паслуг і інш.

*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. — Т. 2 : Лабараторыя традыцыйнага мастацтва — «Яшчур» / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 2006. — 832 с.

2. Нарматыўныя матэрыялы новых тыпаў устаноў культуры / уклад. Н. Ходар, Т. Дзёмінай. — Мінск : БелІПК, 1994. — 111 с.

3. Организация деятельности учреждений культуры клубного типа : учеб. пособие / под общ. ред. Н. П. Гончаровой. — СПб. : изд-во «Лань»; изд-во «Планета музыки», 2015. — 448 с.

4. Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. — 5-е выд., стэр. — Мінск : Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь, 2013. — 144 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ